# ІСЛАМ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ ЯК КУЛЬТУРНА-РЭЛІГІЙНЫ ФЕНОМЕН

**М.В. ПРЫБЫШ, У.І. ІГНАТОВІЧ**
*МДПУ імя І.П.Шамякіна, Мазыр*

На сённяшні дзень адной з самых актуальных і неадназначных праблем з'яўляецца эміграцыя мусульманскага насельніцтва ў краіны Еўропы. Часта людзі выказваюць меркаванне аб тым, што прысутнасць іслама у жыцці хрысціянскіх краін можа вызваць сацыяльныя супярэчлівасці. Аднак яны забываюць аб тым, што іслам прысутнічаў у Еўропе за многа вякоў да сучасных падзей. На тэрыторыі Еўропы існавалі 2 асноўныя ісламскія цывілізацыі на Балканскім паўвостраве і Вялікім Княстве Літоўскім. Другую часта называюць "літоўска-татарскай" або "беларуска-татарскай" у сувязі з саманазвай гэтых людзей.

Каля паловы беларускіх мусульман складаюць татары - беларускія, Волга-Уральскія, сібірскія і крымскія. Продкі сучасных татараў - булгары ў 922 г. прынялі ад арабаў іслам. Татары, акрамя невялікай этнічнай групы - татараў-хрысціян

з'яўляюцца мусульманамі-сунітамі. Маючы тысячагадовую гісторыю функцыянавання сярод татараў, іслам адыграў вялікую ролю ў фарміраванні асноўных напрамкаў духоўнай культуры, вызначыў іх галоўныя асаблівасці [1].

Разглядаючы ролю іслама ў жыцці татарскага народа, неабходна звярнуць увагу на тое, што, нягледзячы на пераважная пачуццё духоўнага адзінства, мусульмане захавалі і інтэгрыравалі шмат разнастайных нацыянальных і рэгіянальных элементаў. Кажучы аб разнастайных "варыянтах" ісламу, у першую чаргу варта зыходзіць з яго універсальнага характару, адсутнасці нацыянальнай замкнутасці або жорсткай прыхільнасці да вызначанага перыяду часу. Гэты ўніверсалізм абумоўлены адноснай памяркоўнасцю ісламу, які дапускае розныя пункты гледжання, і інтэграцыяй многіх разнастайных нацыянальных і рэгіянальных элементаў. Ўмацаванне пазіцый ісламу і мусульманскага духавенства, якое пачалося ў сярэдзіне XIV ст., завяршылася з фарміраваннем самастойных татарскіх ханстваў – Астраханскага, Казанскага, Крымскага і інш.Такім чынам, іслам у XVI ст. становіцца асноўнай рэлігіяй і афіцыйнай ідэалогіяй усіх татараў (акрамя Алтайскіх), ён развіваўся не столькі ў кантэксце мусульманскіх дактрын, колькі ў рамках тых сацыяльна-эканамічных і палітычных умоў, якія складваліся ў татарскіх дзяржавах [1].

Упершыню татары з’яўляюцца на тэрыторыі Беларусі, як заваёўнікі. Падчас мангола-татарскага нашэсця тэрыторыя сучаснай Беларусі была ахоплена пажарам вайны. Ардынцы не былі людзьмі адзінай веры. Сярод іх былі язычнікі (шаманісты), хрысціяне (Арыяне), а ў войску хана Батыя і мусульмане. Важна заўважыць, што войска Батыя на тэрыторыі Беларусі ніколі не спрабавала распаўсюджваць сваю веру сярод хрысціян. З'яўленне досыць шматлікага мусульманскага насельніцтва не толькі не выклікала тут практычна ніякай варожасці з боку немусульман, новая рэлігійная група арганічна ўлілася як у палітычную структуру Вялікага Княства Літоўскага, мультыэтнічнай дзяржавы, дзе дамінаваў беларускі элемент, так і ў беларускую культуру.

У Вялікім Княстве Літоўскім беларускія татары называлі сябе мусульманамі: мусульмане (ад персід. muslim-пададзены волі Бога). Спачатку татары называлі сваё веравызнанне верай бісурманскай, а сябе – бісурманамі..У актах і дакументах беларускіх татараў. неаднаразова сустракаецца падобнае абазначэнне. Аднак пасля яны перасталі ўжываць гэтую назву з тых пор, як пасля войнаў з туркамі слова "бісурман" (басурман) набыло адценне адмоўнай мянушкі.

Даследаванні, праведзеныя вучонымі, паказалі наяўнасць у культуры мусульман Вялікага Княства Літоўскага двух значных слаёў – больш старажытнага, усходнецюрскага (стараўйгурскага), і больш позняга, паўднёвацюрскага (асманскатурэцкага). Інакш кажучы, першапачаткова (у XIV-XV стагоддзях) на мусульманскую культуру Беларусі аказалі ўплыў Сярэдняя Азія і Залатая Арда, а пазней (у XVI-XVII стагоддзях) – Асманская імперыя.

Беларускія татары вызнаюць іслам суніцкага толку. Пацверджанне таму знаходзім у лісце султана Мурада III да Жыгімонта III, якое напісана ў 1591 г. [2]. Суніты лічаць законнымі саратнікамі Мухамеда чатырох першых халіфаў-Абу-Бакра, Умара, Усмана і Алі. Вучэнне сунітаў мае чатыры школы – мазхабы) - малікіцкая, ханафіцкая, ханбаліцкая, шафіцкая. Татары прытрымліваюцца ханафіцкай школы.

На працягу многіх стагоддзяў беларускія татары знаходзіліся аддалённымі ад сваіх рэлігійных цэнтраў на ўсходзе. У сувязі з адсутнасцю ўласных тэалагічных школ, няведаннем арабскай літургічнай мовы і вялікай аддаленасцю ад цэнтраў мусульманскай культуры беларускія татары толькі павярхоўна ведалі асновы свайго веравызнання. Але пры гэтым, агульныя рысы і рэлігійныя прынцыпы не адрозніваліся ад веры ўсіх астатніх мусульман-сунітаў, але захоўваліся элементы, чужыя духу чыстага ісламa, запазычаныя альбо з шаманскіх вераванняў, уласцівых у мінулым туркам-качэўнікаў, альбо з вераванняў мясцовых жыхароў-хрысціян. Яны надавалі рэлігіі літоўскіх татараў своеасаблівы мясцовы каларыт, які, зрэшты, не закранаў асноў Карана. Беларускія татары, пражываючы на землях Вялікага

Княства Літоўскага, актыўна перанімалі элементы рэлігійнага культу мясцовага насельніцтва. На рэлігійную свядомасць ва ўмовах татарскай дыяспары аказалі вялікі ўплыў беларускія хрысціянскія бытавыя традыцыі і абрады, а таксама перажыткі элементаў паганства. У якасці прыкладу можна прывесці абрад, які меў месца быць у беларускай супольнасці мусульман, яны прытрымліваліся паганскага культавага звычая малітвы пра дождж, які практыкаваўся масава ў хрысціян. Але тут уключаўся нацыянальна-рэлігійны элемент: у ахвяру прыносіўся чорны баран. Гэта дзеянне ажыццяўлялася звычайна на беразе ракі сумесна з хрысціянамі, але сама малітва ў татараў здзяйснялася асобна. Сапраўды, суседства з хрысціянамі не магло не аказаць уплыву на рэлігійныя абрады татары, але ўсё ж кананічнае права (шарыят), заставалася нерушымым.

Арыгінальны тэкст Карана літоўскія татары разумелі з дапамогай перакладаў на даступных мовах (беларускай ці польскай). Яны ведалі на памяць шмат сур Карана, якія спявалі падчас набажэнства. Беларускія татары маліліся звычайна дома, у мячэці, часам на мізары (мусульманскія могілкі).

Адзінае карэннае адрозненне ад хрысціян было толькі прафесійнае. Займаючыся рамёствамі і агародніцтвам, татары Беларусі асаблівай славы дамагліся ў вайсковай справе. Ужо ў 1319 годзе крыжакі, сутыкнуліся з атрадам Вялікага князя Гедыміна, які складаўся з беларускіх мусульман. У першую чаргу задачай татарскага войска была ахова мяжы Вялікага Княства Літоўскага ад крыжакоў і Крымскага ханства, з якой яны добра спраўляліся. Па розным падлікам вучных у XVI-XVII стст.. у Вялікім Княстве Літоўскім пражывала 50-60 тыс. мусульман. Скарацілася татарскае насельніцтва ў сувязі з жорсткімі войнамі паміж Маскоўскай дзяржавай і Вялікім Княствам Літоўскім і мілітарызаванай напраўленасцю прафесій.

Мусульманская культура першая з іншых канфесійных груп стварыла на аснове арабскай графікі арыгінальны алфавіт, прыстасаваны для запісу гукаў беларускай мовы, які ў пэўных момантах перадачы гукаў дасканалейшы за два

другія беларускія алфавіты – кірыліцу і лацінку – нават у іх сучаснай форме. На мусульманскіх тэкстах навукоўцы могуць вывучаць асаблівасці беларускай мовы мінулых стагоддзяў.

Мусульманскае насельніцтва, бесперапынна падтрымлівала традыцыю беларускамоўнага кнігапісання да пачатку XX стагоддзя. Толькі аб мусульманах можна з упэўненасцю сказаць, што яны захоўвалі, пісалі і распаўсюджвалі кнігі на беларускай мове нават у самыя цяжкія для беларускай культуры перыяды. Такім чынам можна зрабіць вынік аб узаематалерантных адносінах хрысціян і мусульман на працягу многіх стагоддзяў. Розніца была толькі ў рэлігіі, што не перашкаджала большасці прадстаўнікоў гэтай веры лічыць сябе беларусамі і ўносіць вялікую лепту ў развіццё нашай агульнай культуры.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Давлетшин, Г.М., Хузин, Ф.Ш. Когда и как булгары приняли ислам? // Древние народы и города Поволжья. – Пенза, 1995. – С.130.

2. Канапацкі І.Б., Смолик А.І. Гісторыя і культура беларускіх татар. – Мн., 2000. – С. 178.